ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
2019 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
## аб парадку арганізацыі і правядзення рэгіянальнага фестывалю традыцыйнай культуры "Скарбы Гродзеншчыны"

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення рэгіянальнага фестывалю традыцыйнай культуры "Скарбы Гродзеншчыны" (далей – фестываль).
2. Арганізатарамі фестывалю з'яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама; ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Свіслацкага райвыканкама (Дадатак 1).
3. Мэтамі і задачамі фестывалю з'яўляюцца: захаванне і папулярызацыя рэгіянальных асаблівасцей традыцыйнай культуры Гродзенскай вобласці; далучэнне шырокай грамадскасці да традыцыйнай культуры рэгіёну; папулярызацыя элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны, розных відаў і жанраў традыцыйнай культуры; дэманстрацыя рэгіянальных свят і абрадаў, касцюмаў (аўтэнтычных, рэканструяваных); далучэнне да традыцыйнай культуры дзяцей і падлеткаў, а таксама ўсіх жадаючых праз навучанне і майстар-класы ад носьбітаў тэхналогій традыцыйных рамёстваў, праз народныя гульні, танцы; паказ магчымасцяў уключэння аб'ектаў нематэрыяльнай культуры ў сучасныя эканамічныя працэсы, інтэграцыі традыцыйнай культуры ў маладзёжнае асяроддзе.
4. Фестываль адбудзецца 27 ліпеня 2019 года ў г.Свіслачы Гродзенскай вобласці.
5. У фестывалі прымаюць удзел лепшыя фальклорныя калектывы Гродзеншчыны, народныя тэатры гульні, майстры народнай творчасці раённых Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў, аддзелаў рамёстваў і традыцыйнай культуры раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці, іншыя творчыя калектывы вобласці, а таксама творчыя калектывы і майстры з іншых абласцей Беларусі і замежжа (па запрашэнні аргкамітэта).
6. Праграма фестывалю ўключае: урачыстае адкрыццё; конкурс падворкаў традыцыйнай культуры сярод раёнаў вобласці; конкурс фальклорнага мастацтва; прэзентацыю элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны; інтэрактыўную пляцоўку з гульнёва-забаўляльнымі

праграмамі; інтэрактыўную пляцоўку па навучанні побытавым танцам; падвядзенне вынікаў, узнагароджванне ўдзельнікаў і пераможцаў фестывалю, круглы стол.

7. У рамках фестывалю праводзіцца конкурс падворкаў традыцыйнай культуры і конкурс фальклорнага мастацтва па наступных намінацыях:

- “Лепшы падворак традыцыйнай культуры Гродзеншчыны”;
- “Лепшая калекцыя работ традыцыйных рамёстваў”;
- “Лепшае прыгатаванне традыцыйнай стравы Гродзеншчыны”;
- “Лепшая прэзентацыя падворка традыцыйнай культуры Гродзеншчыны”;
- “Лепшы аўтэнтычны калектыў”;
- “Лепшы дзіцячы фальклорны калектыў”;
- “Лепшы дарослы фальклорны калектыў”.

8. Пераможцаў конкурсу вылучае кампетэнтнае журы (Дадатак 2).

9. У кожнай намінацыі журы вылучае лаўрэатаў I, II, III ступені, якія ўзнагароджваюцца дыпломамі ў рамках і прызамі.

10. Журы ўзнагароджвае канкурсантаў і ўдзельнікаў фестывалю таксама спецыяльнымі прызамі і дыпломамі ў рамках:

- “за пераемнасць народных традыцый і інтэграцыю ў маладзёжнае асяроддзе”;
- “за папулярызацыю мясцовых танцавальных традыцый”;
- “за лепшую гульнёва-забаўляльную праграму”;
- “за самабытнасць акцёрскага майстэрства”;
- “за самабытнасць і адметнасць выканальніцкага стылю”;
- “за дзейсную папулярызацыю абрадавых і святочных традыцый Гродзенскага Панямоння”;
- “лепшы фальклорны інструментальны ансамбль”;
- “лепшы народны музыка”.

11. Усе ўдзельнікі фестывалю ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел у фестывалі.

12. Журы пакідае за сабой права ў межах агульнага прызавога фонду аб’ядноўваць, падзяляць прызавыя месцы, вызначаць дадатковыя намінацыі.

13. Для ўдзелу ў конкурсе падворкаў кожны раён павінен прадставіць падворак традыцыйнай культуры, які прадугледжвае: тэатралізаваную прэзентацыю падворка; майстар-класы па традыцыйных рамёствах; выстаўку-продаж вырабаў майстроў народнай творчасці; дэгустацыю мясцовых страў; прэзентацыю элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзенскай вобласці, якія ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, а таксама тых элементаў, якія знаходзяцца ў рэгіянальным інвентары на перспектыву.

14. Выбар тэмы, віду і характару работ, якія дэманструюцца на фестывалі, не абмяжоўваюцца.
15. Абавязковым патрабаваннем з'яўляецца іх адпаведнасць традыцыям пэўнага віду народнай культуры, народных промыслаў і рамёстваў.
16. Для ўдзелу ў конкурсе фальклорнага мастацтва неабходна да 17.07.2019 года на электронны адрас ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" (onmcnt@tut.by) даслаць заяўку з адзнакай "Скарбы Гродзеншчыны" (Дадатак 3).
17. Кожны калектыў (ці індывідуальны выканаўца), які будзе адабраны для ўдзелу ў конкурсе фальклорнага мастацтва, прадстаўляе не больш 3 нумароў: вакальныя, інструментальныя, танцавальныя, народная проза.
18. На інтэрактыўнай пляцоўцы з гульнёва-забаўляльнымі праграмамі ўдзельчаюць лепшыя тэатры гульні вобласці.
19. На інтэрактыўнай пляцоўцы па навучанні побытавым танцам прымаюць удзел фальклорныя калектывы, спецыялісты па фальклоры раённых цэнтраў культуры, кіраўнікі фальклорных калектываў, усе жадаючыя.
20. Касцюмы, абутак, галаўныя ўборы ўдзельнікаў фестывалю павінны адпавядаць варыянтам арыгіналаў або копій традыцыйных народных касцюмаў сваёй мясцовасці.
21. Пры падвядзенні вынікаў фестывалю журы ўлічвае:
- мастацкае і тэхналагічнае майстэрства, якое адпавядае народным традыцыям;
- рэжысёрскае вырашэнне прэзентацыі падворка;
- мастацкі ўзровень і дасканаласць тэхнікі гатовых калекцый;
- выкарыстанне ў работах народных традыцый, іх тактоўную інтэрпрэтацыю ў адпаведнасці з сучаснымі ўмовамі;
- даступнасць і нагляднасць дэманстрацыі тэхналагічных і творчых працэсаў;
- эфектыўнасць і выніковасць правядзення майстар-класаў;
- валоданне рэгіянальнай манерай выканання;
- захаванне мясцовага рэпертуару і мастацкага стылю;
- узровень выканальніцкага майстэрства.
22. Дастаўка выставачнага абсталявання, затраты на правядзенне майстар-класаў, дэкаратыўныя матэрыялы для афармлення выставак, камандзіровачныя выдаткі - за кошт накіроўваючай арганізацыі.
23. Фінансаванне выдаткаў рэгіянальнага фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.
24. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: выраб афіш, праграм фестывалю, дыпломаў, буклетаў, банера; работа вядучых; аплата членам

журы; паслугі па музычным афармленні і гукавым узмацненні; прызы, спецыяльныя прызы; рамкі для дыпломаў; аплата выступлення гасцей фестывалю (прафесійныя выканаўцы).

25. Для фінансавання фестывалю могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

26. Арганізатары фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў выканаўцаў і калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам і калектывам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэгіянальнага фестывалю традыцыйнай культуры “Скарбы Гродзеншчыны”

СКЛАД АРГКАМІТЭТА
рэгіянальнага фестывалю традыцыйнай культуры “Скарбы Гродзеншчыны”

| | | |
|---|---|---|
| Куратчык Сняжана Віктараўна | - | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Паўлючэня Ірына Эдуардаўна | - | начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Свіслацкага райвыканкама, сустаршыня аргкамітэта; |
| Мурэня Алена Уладзіміраўна | - | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Грыгаран Таццяна Уладзіміраўна | - | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Жук-Куніцкая Ірына Юр’еўна | - | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Мацкевіч Таццяна Леанідаўна | - | дырэктар ДУК “Свіслацкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”; |
| Пятрук Андрэй Пятровіч | - | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Шлавянец Вольга Францаўна | - | загадчык аддзела традыцыйнай культуры ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Шунейка Алена Феліксаўна | - | метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. |

**Форма**

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэгіянальнага фестывалю традыцыйнай культуры "Скарбы Гродзеншчыны"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама

Начальнік аддзела культуры гар(рай)выканкама

Загадчык сектара культуры райвыканкама

ЗАЯЎКА
на ўдзел у рэгіянальным фестывалі традыцыйнай культуры
"Скарбы Гродзеншчыны"

1. Раён, установа, якую прадстаўляе калектыў (індывідуальны выканаўца)__
______________________________________________________________
2. Поўная назва калектыву (выканаўцы)_____________________________
______________________________________________________________
3. Колькасны склад удзельнікаў калектыву__________________________
______________________________________________________________
4. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву__________________
______________________________________________________________
5. Пашпартныя дадзеныя кіраўніка калектыву (сольнага выканаўцы)_______
______________________________________________________________
6. Спіс твораў, якія будуць прадстаўлены ў конкурснай праграме__________
______________________________________________________________
7. Кантактны тэлефон____________________________________________

Кіраўнік базавай установы

______________________ ______________
*(ініцыялы, прозвішча)* *(подпіс)*